клад, "рысасловы" Л. Сільновай распаўсюджваюцца ў друкаваным выглядзе ў кніжках.

Сучасная беларуская візуальная паэзія – маргінальная з'ява, якая не мае вялікага ўплыву на літаратурны працэс, але ўсе яе прыклады ўяўляюць сабой своеасаблівыя спробы ўвесці беларускую літаратуру ў агульнакультурны кантэкст. Візуальная паэзія падкрэслівае пэўную ўмоўнасць, размытасць мяжы паміж паэзіяй і выяўленчым мастацтвам і з'яўляецца цікавым матэрыялам для далейшых даследаванняў.

Літаратура


Аксак В. Антычны дождж. Вільня, 1999.
Александровіч А. Прозалаць. Мн., 1926.
Арлоў У. Simeonus, Jeromonachus Polocensis // Крыніца. 1995. № 5. С. 12.
Барысевіч Ю. Цела і тэкст. Мн., 1998.
Віталін З. Срэбны бусел: Малюнак вершам // Маладняк. 1931. № 3. С. 69–70.
Вішнёў З. Творы надрукаваны вішнёвымі ботамі // Мастацтва. 1998. № 11. С. 34–38.
Жуковіч В. "Антычны дождж" – з нябёсаў паэтычных // ЛіМ. 2001. 23 лют. (№ 8). С. 7.
Жуковіч В. [Вершы] // Першацвет. 1995. № 4. С. 67–68.
Кавалеўскі А. [Вершы] // Першацвет. 1998. № 2. С. 44-45.
Кавалеўскі А. Пачатак логафармізму: Маніфест // Першацвет. 1999. № 7-8. С. 38–39.
Казлоўскі В. Слова аб юнай краіне. Мн., 1932.
Мінскевіч С. Праз галерэю. Полацак, 1994.
Пацюпа Ю. Ноч. Мн., 1991.
Пісьмянкоў А. Вершы. Мн., 1997.
Поэзия русского футуризма. СПб., 1999.
Пушча Я. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1993. Т. 1.
Сільнова Л. Рысасловы. Полацак, 1994.
Скрыган Я. Некалькі хвілін чужога жыцця. Мн., 1990.


Паступіла ў рэдакцыю 28.11.2001.

***Віктар Вячаслававіч Жыбуль*** – аспірант кафедры беларускай літаратуры XX ст. Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар Л.Дз. Сінькова.

*А.У. СУЗЬКО*

## ГАМЕР І ЯГО ТВОРЧАСЦЬ У МАСТАЦКАЙ СІСТЭМЕ М. ТАНКА

Исследуется эстетическое влияние личности и творчества Гомера на художественную систему Максима Танка, выявляется преемственность творческого опыта в эпическом освоении мира.

In the article one makes the attempt to investigate the aesthetic influence of the personality and the creative activity of Homer over Maxim Tank's artistic system. The investigator's main purpose is to bring to light and to demonstrate the succession of the creative experience in the epic comprehension of the world.

Жывое мастацкае слова праз вякі струменіць гаючай энергіяй, палоніць чуйныя да прыгажосці сэрцы, прымушае імкнуцца да духоўнага абсалюту. Інакш як растлумачыць, што вось амаль ужо тры тысячагоддзі зачароўвае і натхняе творчых людзей асоба і мастацкая спадчына вялікага паэта антычнасці Гамера.

Пад магічнае ўздзеянне легендарнага паэта трапіў і Максім Танк. Прага самаўдасканалення, спроба знайсці сваё "я" ў літаратурным свеце прымусілі яго яшчэ ў 30-я гг. XX ст. шукаць духоўных настаўнікаў. Ды і само напружанае, поўнае трагізму і болю жыццё народа Заходняй Беларусі вымагала апрабацыі найболып аптымальных форм выяўлення рэчаіснасці. Невыпадкова на старонках "Лісткоў календара" паэт занатаваў словы Г. Гейнэ, што адпавядалі яго асабістым развагам: "Здаецца, слухаеш «Адысею», у якой, на жаль, не будзе свайго Гамера" (Танк 1970, 18). Гаротны, абяздолены, знясілены доўгімі пошукамі выйсця з зачараванага кола, як персанажы славутай гамераўскай "Адысеі", але жывучы, мудры, таленавіты народ, здольны пасмяяцца і з сябе, і са сваёй долі, варты быў стаць аб'ектам



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

мастацкага адлюстравання ў шырокім эпічным палатне. Зварот М. Танка да творчага вопыту старажытнага паэта абумоўлена найперш тым, што эпас пазначаны прасторавай і часавай шырынёй ахопу народнага жыцця, дакладнасцю выяўлення рэалій побыту. Выключная аб'ектыўнасць і ў той жа час кранальная спачувальнасць да чалавека ў спасціжэнні свету народнага быцця, як вядома, застаюцца творчым арыенцірам для многіх мастакоў эпічнага складу. Нягледзячы на глыбокае перакананне Гамера ў тым, што багі з'яўляюцца творцамі найвышэйшай гармоніі, чалавек на старонках яго паэм паказаны ва ўсёй сваёй велічы і духоўнай прыгажосці: ці то мужны, моцны фізічна герой, які не саромеецца сваіх слёз (“Тогда, прослезяся, // Бросил друзей Ахиллес, и далеко от всех, одинокий, // Сел у пучины седой, и, взирая на понт темноводный, // Руки в слезах простирал, умоляя любезную матерь...” (Гомер 1985, 23)); ці то араты, знясілены працай (“Так помышляет о сладостном вечере пахарь, день целый // Свежее поле с четою волов бороздивший могучим // Плугом, и весело день провожает он взором на запад – // Тащится тяжкой стопою домой он готовить свой ужин” (Гомер 1983, 162)); ці то клапатлівая маці, што павінна карміць дзяцей (“Но ничто не могло устрашить ахеян; держались // Ровно они, как весы у жены рукодельницы честной, // Если, держа коромысло и чаши заботно равняя, // Весит волну, чтоб детям промыслить хоть скудную плату” (Гомер 1985, 199)). Такім чынам, традыцыя абагаўлення звычайнага чалавека бярэ свой пачатак яшчэ ў творчасці антычнага паэта. Гэтым мастацкім прынцыпам кіраваўся і М. Танк, які, па словах Л. Корань, «у часы атэізму-цынізму ўшанаваў "у парэпанай раме дзвярэй", як на іконе, святых беларускіх пакутнікаў, сялян, чыім цяжкім рукам "у дзверы раю грукаць"» (Корань 1996, 168). Паэту заўсёды балела сэрца за родны народ, пакутлівы і таленавіты, якому ён быў удзячны за свой паэтычны дар ("Спатканне" (1936), "Песня кулікоў" (1936), "Маці" (1943), "Рукі маці" (1951), "Перакройванне шыняля" (1967), "Мыццё бабкі Уляны" (1967)).

Спрадвечнасць, чысціня народная, еднасць з прыродай, а значыць, з Сусветам, з космасам спрыяюць нараджэнню сапраўдных талентаў:

Тутака такія жывучыя крыніцы,
Вада якіх гоіць раны,
Гасіць агонь і смагу.

Тутака такія дрэвы,
З якіх крыжы і калыскі,
Тапарышчы і зрубы хат
Пяюць.

А самае дзіўнае – людзі,
Стойкасці,
Жывучасці,
Пявучасці якіх
Зайздросцяць нават
Гэтыя камяні,
Крыніцы
І дрэвы.

(*Танк* 1990, 246)

Славутая інтэлектуальная старажытнагрэцкая культура ўзрастала на народнай глебе міфалогіі і фальклору. Міфічны музыка Арфей выконваў спрадвечна сялянскую працу, пасвіў жывёлу. Што ж датычыцца Гамера, то ў сучаснай мастацкай свядомасці ўзнік наступны яго вобраз: "...сляпы і мудры (а згодна з Авідзіем, яшчэ і бедны), абавязкова стары пясняр, які стварае выдатныя сказы пад пастаянным кіраўніцтвам музы, што натхняе яго, і які вядзе жыццё нейкага вандроўнага рапсода..." (Лосев 1997, 45 – пераклад *А. С.*).



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Носьбітамі ж ідэі пераемнасці, універсальнасці мастацтва ў беларускай этнічнай культуры, паводле У. Конана, былі "вандроўныя песняры, музыкі, дудары і гусляры, надзвычай папулярныя ў традыцыйным побыце сялянства" (Конан 2001, 23). Прамым нашчадкам народных талентаў лічыў сябе і М. Танк, што засведчана ў яго вершах "Стол" (1957), "Гісторыя вёскі Пількаўшчына" (1964), "Як я стаў паэтам" (1970), "Я помню..." (1987), "Тутака" (1988) і інш. Паэт падкрэсліў не толькі сваю кроўную повязь з нацыянальнай культурнай традыцыяй, але і духоўную лучнасць з агульначалавечымі эстэтычнымі пошукамі. Два пачаткі – нацыянальны і універсальны – арганічна суіснуюць у мастацкай прасторы М. Танка. Як дрэва, глыбока ўкаранёнае ў роднай зямлі, цягнецца паэт уверх, да вышынь агульначалавечай культурнай думкі:

Старыя дрэвы!
Я з пашанай спыняюся
Перад імі ў прывітанні,
Бо многім абавязаны ім
У сваім жыцці.
Хаця вядома:
У іх араванай засені
Заўжды расці нялёгка.

(*Танк* 1996, 24)

Такім чынам, у мастацкім асэнсаванні культурнага вопыту чалавецтва паэтам кіруе не толькі натуральнае імкненне аддаць даніну павагі агульнапрызнаным аўтарытэтам, але і жаданне ўласнага творчага росту. Прычым дзве культурныя стыхіі не саступаюць адна адной, кожная з іх – унікальнае сведчанне самабытнасці і жыццяздольнасці народаў, важкасці і значнасці іх духоўных набыткаў.

Мастацкі твор набывае агульначалавечую значнасць толькі пры ўмове выяўлення нацыянальнага быцця ў яго маштабнасці і складанасці. З вышыні ж універсальнага мастацкага вопыту больш выразна бачацца набыткі і страты нацыянальнай рэчаіснасці. Нават асабістая творчасць і праца калег па паэтычным цэху ацэньваюцца праз прызму культурнай традыцыі, у прыватнасці асобы і творчасці Гамера. У мастацкай сістэме Максіма Танка Гамер з'яўляецца своеасаблівым эстэтычным арыенцірам, узорам самаахвярнай любові да творчасці, духоўным абсалютам. Трэба адзначыць, што духоўная прысутнасць антычнага генія даволі адчувальная ў творчасці кожнага мастака, бо прыярытэт яго засведчыў сам час, які адмятае ўсё пустое і непатрэбнае, пакідаючы грунтоўнае і каштоўнае. Усведамленне сваёй жывой повязі з Гамерам прымушае творцу паразважаць над маральным і духоўным абліччам сваіх сучаснікаў, што пэўным чынам звязаны з паэтычнай дзейнасцю. Справядлівы суд часу павінен узважыць на сваіх шалях і наступную сітуацыю з танкаўскай сучаснасці:

На юбілеі славутым яго
Людзей было больш, як на трызне Гамера,
Бо кожны хацеў паглядзець на таго,
Хто столькі за век свой спаганіў паперы.

(*Танк* 1979, 149)

У дадзеным выпадку Гамер, безумоўна, найвышэйшая інстанцыя, праз якую вызначаецца вартасць намаганняў сучасных пісьменнікаў. Па сутнасці, свята ператвараецца не ва ўшанаванне юбіляра, а ў грамадскі суд. З дапамогай прынцыпу мастацкага кантрасту падкрэсліваецца найвялікшая бездань паміж сумленнай творчасцю Гамера і пустым, бясплённым пісаннем графаманаў, што нагадвае хранічную хваробу. На старонках "Дзённікаў" выявіўся ўстрывожаны роздум мастака: "Цяжка, бывае, жывецца з людзьмі



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

геніяльнымі, але яшчэ горш – з пасрэднымі, якія лічаць сябе геніяльнымі. Стараюся ад іх трымацца воддаль, хоць мне і не заўсёды гэта ўдаецца" (Танк 1997, 157). Бясспрэчна, шэрыя пасрэднасці з непамернымі амбіцыямі здатны апаганіць, апошліць любую справу. Горка-іранічная з'едлівасць мастака ў вершы выяўляе нясцерпны боль за здзек са святыні, таямніцы працэсу творчасці. У барацьбе з ваяўнічым злом паэт абапіраецца на народную мараль, мудрую і важкую. Аднавяскоўцы і родныя М. Танка ўмелі і любілі працаваць, аддаючыся справе цалкам, укладваючы ў яе ўсю душу і сэрца. Таму марнатраўства, пустая трата часу і матэрыяльных каштоўнасцей уяўляюцца яму найвялікшым грахом. А як сакавіта па-беларуску, трапна сказана, з адпаведным адмоўна-ацэначным напаўненнем: "...спаганіў паперы"! У гэтых словах пульсуе выключная адказнасць перад кожным словам, пачуццём мастацкай меры, сціпласць, што павінны быць уласцівы сапраўднаму творцу. На думку М. Танка, страшная небяспека для літаратуры хаваецца ў дзеяннях графаманаў, пра што сведчаць наступныя вершы: "Я радуюся" (1960), "Вучань класікаў" (1970), "Намячаецца скарачэнне штатаў..." (1975), "Сціло і ланцэт" (1994) і інш. Так, у святле вечнага больш выразныя абрысы набывае грамадскае зло.

М. Танк бескампрамісны да любых праяўленняў пустазвонства і дэмагогіі ў мастацкай творчасці:

У Гамера ён вучыўся быць сляпым,
У Байрана – кульгаць,
У Поля Фора – донжуаніць,
У Хемінгуэя – піць віскі...
І дзівіцца: чаму яго
Не лічаць класікам.

(*Танк* 1979, 360)

Замест глыбока асабістага асэнсавання творчасці майстроў мінулага, спробы разгадаць таямніцы працэсу творчасці адбываецца павярхоўнае, знешне мімікрычнае імітаванне класікі. Але ж перайманне паводзін, фізічных адметнасцей не ёсць самаўдасканаленне, развіццё свайго ўнутранага патэнцыялу. Міжволі падкрэсліваецца думка аб тым, што толькі сапраўднаму таленту дадзена ўбачыць і пазнаць сутнаснае, быційнае.

Менавіта "зрокавы" пачатак у адносінах да рэчаў першапачаткова з'яўляўся сутнаснай дамінантай антычнай культуры. Напачатку ўзнік нават адпаведны тэрмін "эйдас" – "тое, што бачна", які паступова набыў больш глыбокі сэнс – "канкрэтная з'ява", "цялесная ці пластычная дадзенасць". Так і Гамер адкрыта захапляецца прыгажосцю багоў, герояў, рэчаў. Нават светабудова набывае канкрэтнае пластычнае выяўленне на шчыце Ахіла, зробленым богам-майстрам Гефестам:

Там представил он землю, представил и небо, и море,
Солнце, в пути неистомное, полный серебряный месяц,
Все прекрасные звезды, какими венчается небо.

(*Гомер* 1985, 23)

Слушна адзначае даследчыца антычнай культуры А. Таха-Годзі: «Старажытныя грэкі, як вядома, увогуле не падзялялі мастацтва і рамёствы. Яны, падзеленыя ў Новы час, тысячагоддзе таму назад былі адзінствам, нават называліся адным словам – "тэхнэ". Кожная рэч, што выйшла з рук рамесніка, была не толькі карысная, але і прыгожай, а стваральнік яе быў сапраўдным Майстрам. Так было ў жыцці, так было і ў міфе» (Таха-Годзі 1989, 174–175). У абагульненай форме Гамер апавядае пра гісторыю свайго народа, яго звычаі і традыцыі.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Падобную змястоўнасць набываюць у танкаўскай паэзіі звычайныя рэчы вясковага побыту. Кожны такі прадмет, паводле М. Танка, увасабляе гістарычную памяць, бо злучае ў адно цэлае некалькі пакаленняў. Рэчы захоўваюць духоўную энергію продкаў, цяпло іх рук, таму з'яўляюцца своеасаблівымі сувязнымі чалавечых душ. Так, у вершы "Стол" звычайны, пашчэрблены стол нагадаў лірычнаму герою асілка-дзеда Каліну, самабытнага народнага музыку Кузьму. Сваім узнікненнем у хаце лірычнага героя стол абавязаны дзеду, які ўласнымі рукамі выштукаваў яго з дрэва, а музыку Кузьму нават адпявалі на гэтым стале. Паэтызацыі рэчаў вясковага побыту прысвечаны цэлы шэраг танкаўскіх вершаў: "Конаўка" (1959), "Печ" (1959), "Тапор" (1960), "Бібліятэка" (1964) і інш. Безумоўна, прынцып эпічнага любавання рэчамі зблізкае эстэтычныя пошукі Гамера і М. Танка, парушаючы часавую дыстанцыю. Зрокавае спасціжэнне складанасці матэрыяльнага свету, такім чынам, і зараз захоўвае свой прыярытэт.

Але ж уся парадаксальнасць сітуацыі закпючаецца ў тым, што паводле традыцыйнай версіі Гамер быў сляпым. Ужо тады старажытныя людзі зразумелі, што пазнаць свет толькі пры дапамозе вачэй проста немагчыма. Гэтую адметнасць антычнага светапогляду адчуў С. Аверынцаў: «Менавіта таму, што элінская культура была схільная да зрокавага эфекту, "эйдасу", яна рана пачала атаясамліваць мудрасць, гэта значыць паглыбленне ў таямніцы быцця, з фізічнай слепатой. Сляпыя вяшчун Цірэсій і натхнёны музамі Гамер. Эдып, які ўбачыў за суцяшальнай відавочнасцю страшную таямніцу, выкалвае вочы, якія яму здрадзілі» (Аверинцев 1997, 61).

Старажытную ісціну, закпючаную ў тым, што толькі талент здатны пераадолець чалавечую абмежаванасць у пазнанні свету, зразумець сэнс быцця, глыбока ўсвядоміў і М. Танк у вершы "Гамер". Паэт свядома парушае ўсталяваную вякамі традыцыю, вырываючы антычнага творцу з яго часу і пераносячы ў наш. Танкаўскі Гамер – узор сучаснага мастака, апантанага творчасцю. Напэўна, пакутлівыя развагі самога М. Танка над таямніцай працэсу творчасці і сутнасцю паэта вылілiся пранікнёнымі радкамі верша. Аднаму мастаку дадзена зведаць вышэйшы сэнс быцця, адгарнуць заслону недазволенага. Творчасць ператвараецца ў сэнс жыцця, а можа, гэта і ёсць сапраўдны яго сэнс? Не з мэтай звычайнага марнавання часу і пустой мітусні створаны чалавек. Сэнс яго жыцця мае вышэйшую зададзенасць. На жаль, людзі духоўна сляпыя і не разумеюць мастака, што імкнецца адкрыць ім таямніцы быцця, таму і ўзнікае адпаведны канфлікт паміж паэтам і натоўпам. Мастак асуджаны на пакуту, бо сляпы ў сваіх памкненнях натоўп, атупелы ад сваёй недалёкасці ці адурманены жрацамі, закідвае прарокаў камянямі ці высмейвае. Трагедыя непаразумення становіцца яго лёсам. Тым не менш пакуты гэтыя шчаслівыя ("Паэзія" (1955), "Трактат аб паэзіі" (1962), "Вы думаеце, гэта шчасце..." і інш.)).

Нават адпачынак закпючаны для паэта ў працы, ён увесь час думае, назірае, разважае, інакш наступіць духоўная смерць. Сытае абывацельскае шчасце не задавальняе яго. Паэт жыве ў свеце, створаным ім самім. Таму пакутуюць яго родныя і блізкія:

Ты, напэўна, сляпы,
Бо не бачыш пакут Наўсікаі,
Што не зводзіць з цябе
Сваіх воч, закаханых, гарачых,
    Як прыносіць заўжды
    Раніцой табе мёду і хлеба.
    Ты ж – заняты паэмай,
    Падзякаваць ёй забываеш.

(*Танк* 1979, 443)



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Амаль праз усю творчасць Максіма Танка праходзіць думка аб тым, што мастак – гэта творца, дэміург; бо той, хто здолеў зазірнуць за заслону недазволенага, паспрабаваў спасцігнуць вышэйшы сэнс быцця, ужо не можа жыць як звычайны чалавек. Мастак творыць свой свет з хаосу, а значыць, спаборнічае з самім Творцам: "Янук Сяліба", "Люцыян Таполя", "Гамер", "Гекзаметр", "Адначасна з'яўляюцца на свет"... Ад нараджэння чалавек трапляе нібы ў зачараванае кола: ён асуджаны на смерць. Але ж смерць адступае перад тымі, хто дакрануўся да быційнага, сутнаснага. Сярод іх М. Танк з гонарам першым называе імя Гамера:

Адначасна з'яўляюцца на свет
І чалавек і яго смерць.
І толькі нямногім –
Гамеру, Дантэ, Шэкспіру,
Пушкіну...
Пераджыць удалося
Сваю неадлучную сяброўку.

(*Танк* 1994, 67)

Бяспрэчна, смерць няўладна над вышэйшым праяўленнем чалавечага духу – творчасцю. Міжволі пачынаеш думаць пра час не як пра пэўны момант, падказаны табе гадзіннікам, а як пра катэгорыю абсалютную, касмічную, неабсяжную, дзе любая старажытная рэч ёсць след, знак, рэха абсалютнага часу. Асновай і сутнасцю ўсяго вартага і вялікага з'яўляецца высокі Дух як вышэйшы субстант Божага свету. Таму так невыносна балюча беларускаму паэту М. Танку, калі чыняць здзекі з жывога духу – мастацкага слова, калі ісціна становіцца аб'ектам высмейвання.

Літаратура

Аверинцев С. Поэтика ранневизантийской литературы. М., 1997.
Гомер. Илиада / Пер. с др.-греч. Н. Гнедича. М., 1985.
Гомер. Одиссея / Пер. с др.-греч. Н. Гнедича. М., 1993.
Конан У. Арфічныя матывы і хрысціянскія архетыпы ў паэзіі Францішка Багушэвіча // Роднае слова. 2001. № 4. С. 23.
Корань Л. Постаць Максіма Танка / Корань Л. Цукровы пеўнік: Зб. арт. Мн., 1996. С. 168.
Лосев А.Ф. Античная литература`/ Под ред. проф. А.А. Тахо-Годи. М., 1997.
Танк М. Лісткі календара. Мн., 1970.
Танк М. Збор твораў: У 6 т. Мн., 1979. Т. 4.
Танк М. Паслухайце, вясна ідзе... Мн., 1990.
Танк М. Мой каўчэг. Мн., 1994.
Танк М. Errata. Мн., 1996.
Танк М. Дзённікі // Полымя. 1997. № 6. С. 157.
Тахо-Годи А.А. Греческая мифология. М., 1989.

Паступіла ў рэдакцыю 20.12.2001.

***Алена Уладзіміраўна Сузько*** – аспірантка кафедры беларускай літаратуры XX ст. Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук А.Л. Верабей.

*Т.К. КРАСОВСКАЯ*

## ЖАНРОВО-СТИЛЕВЫЕ ОСОБЕННОСТИ ПЬЕС АНДРЕЯ ПЛАТОНОВА

Статья посвящена жанрово-стилевому своеобразию пьес А. Платонова. Выделены жанровые доминанты: особенности героя, конфликта. Отмечена специфика языка пьес драматурга.

The article is devoted to the originalities of genre and style of pieces of A. Platonov. The basic genre majorants: the hero, conflict are allocated. The specificity of language of the plays is marked.

А. Платонов вошел в историю русской литературы не только как талантливый прозаик и критик, но и как драматург. Его перу принадлежат десять



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm